# ***Прыметнік* (6 клас)**

*1. Адзначце правільныя сцверджанні:* 1) Прыметнік адказвае на пытанні ***які? чый?***; 2) Прыметнікі ў сказе паясняюць дзеясловы і адказваюць на пытанні ***дзе? куды? чаму?***; 3) Прыметнікі ў сказе дапасуюцца да назоўнікаў.

*2. Адзначце прыметнікі:* 1) блакітны; 2) крык; 3) крыклівы; 4) сінец; 5) сіні.

*3. Якія прыметнікі адказваюць на пытанні* **чый? чыя? чыё? чые?** *і не спалучаюцца са словамі* ***вельмі, надта***: 1) якасныя; 2) адносныя; 3) прыналежныя.

*4. Адзначце словазлучэнні з якаснымі прыметнікамі:* 1) гарачы дзень; 2) жоўты лісток; 3) залаты пярсцёнак; 4) ластаўчына гняздо; 5) салодкі мёд.

*5. Адзначце словазлучэнні, у якіх прыметнікі не з'яўляюцца прыналежнымі:* 1) курыны грэбень; 2) курыны почырк; 3) лісіная шуба; 4) лісіная нара.

*6. Прыметнікі якога разраду не маюць ступеней параўнання:* 1) адносныя; 2) прыналежныя; 3) якасныя.

*7. Адзначце формы вышэйшай ступені параўнання:* 1) багацейшы; 2) даражэйшы; 3) наймацнейшы; 4) прасцейшы; 5) самы важны.

*8. Адзначце прыметнікі, ад якіх не ўтвараюцца формы параўнання:* 1) босы; 2) вялікі; 3) глухі; 4) малады; 5) сляпы.

*9. Адзначце прыметнікі, утвораныя спосабам складання:* 1) асенне-зімовы; 2) запалярны; 3) легендарны; 4) марозаўстойлівы; 5) міжарабскі.

*10. Выкрасліце ў кожным радзе чацвёрты "лішні" прыметнік:* 1) горкі, кіслы, малы, салодкі; 2) адважны, адчайны, лысы, смелы; 3) бабровы, вераб'іны, воўчы, пшанічны.

*11. Адзначце словазлучэнні мужчынскага роду:* 1) вялік… шымпанзэ; 2) бел… гусь; 3) нов… шынель; 4) высок… жырафа.

*12. Адзначце сказы, у якіх дапушчаны памылкі ва ўжыванні форм ступеней параўнання:* 1) Паклон табе самы нізкі, мой край залацістых бароў; 2) Аліна хоць і самая маладзейшая, але ведала ўсе Лізавецціны песні; 3) На свеце няма больш даражэйшых дарог, чым дарога да роднага дому.

*13. Вызначце род, лік і склон прыметнікаў:* 1) пайсці да лепшага сябра___________________ ; 2) сустрэў старэйшага брата______________________ ; 3) у дружным класе_____________________ ; 4) на высокай гары______________________ ; 5) пры добрым надвор'і_____________________ .

*14. Ад назоўнікаў, што ў дужках, утварыце і запішыце прыметнікі:* 1) (брат) касцюм ___________________ ; 2) (Зося) кніга _____________________ 3) (дзед) паліто ____________________ ; 4) (Міколка) партфель__________________ ; 5) (сарока) пяро _______________.

*15. Выберыце правільны варыянт напісання суфіксаў прыметнікаў:* 1) восе(нь/н)скі; 2) рыб(кс/ц)кі; 3) тавары(шс/с)кі; 4) уша(чс/ц)кі; 5) таджы(кс/ц)кі.

*16. Адзначце словы, дзе прапушчаны НН:* 1) алавя…ы; 2) даўжэ…ы; 3) каме…ы; 4) салаўі…ы; 5) страмя…ы.

*17. Адзначце прыметнікі, якія пішуцца праз злучок:* 1) беларуска…ўкраінскі; 2) Буда…Кашалёўскі; 3) Нава…полацкі; 4) права…бярэжны; 5) паўднёва…заходні.

*18. Адзначце словазлучэнні, у якіх НЕ (НЯ) трэба пісаць разам:* 1) зусім (не, ня)далёкая дарога; 2) (не, ня)абсяжны прастор; 3) (не, ня)лёгкая, а складаная задача; 4) (не, ня)чуваны поспех; 5) (не, ня)сцерпная гарачыня

*19. Падкрэсліце ўсе прыметнікі як члены сказа:* 1) Як многа іх [грыбоў], і ўсе таўсматы, прыземісты, карэнкаваты, чорнагаловы, паўнацелы, як тонкі кужаль, знізу белы; 2) У познюю восень вада пад мастком чыстая і халодная; 3) Які сяголета шчаслівы і ўраджайны год: ва ўсіх садах агрэст і слівы, клубніцы повен агарод.